**Храпавіцкая, Н.** Спевы, якія кранаілі да глыбіні душы / Наталля Храпавіцкая // Лепельскі край. — 2022. — 2 снеж. — С. 12.

## СПЕВЫ, ЯКІЯ КРАНАЛІ ДА ГЛЫБІНІ ДУШЫ

Імя Ігара Вішнеўскага вядома шматлікім жыхарам нашага раёна. Яго яркія выступленні з першых секунд кранаілі да глыбіні душы гледача, яго ўнікальныя артыстызм і энергію немагчыма апісаць простымі словамі.

57 гадоў… Здавалася б, яшчэ жыць і жыць, радавацца дасягненням дзяцей, поспехам любімага ўнука, дарыць радасць людзям на канцэртах…

Вельмі цяжка паверыць, што Ігара Анатольевіча ўжо няма побач з намі. Яго смерць стала вялікай стратай не толькі для родных і блізкіх, але і калег, многіх жыхароў раёна.

Нарадзіўся Ігар Анатольевіч у 1965 годзе ў горадзе Фрунзе (Кіргізія) у сям'і рабочых.

Падчас размовы з мужчынам ён заўсёды с цеплынёй казаў пра маляўнічасць прыроды ў гэтай краіне, якая можа зачараваць сваёй прыгажосцю кожнага: зялёныя горныя схілы, шум горных рэк, высакагорныя азёры…

— Ноч у палатцы, дзе да неба можна дакрануцца рукой, лёд на вяршынях гор — такой прыгажосці больш нідзе немагчыма знайсці, — казаў Ігар Анатольевіч.

Пасля заканчэння васьмігодкі хлопец паступіў ў Фрунзенскі машынабудаўнічы тэхнікум. Атрымаўшы прафесію тэхніка-тэхнолага, пачаў працоўны шлях на заводзе токарам на станку з лічбавым праграмным кіраваннем.

Аднак затрымаўся там нядоўга, некалькі месяцаў, бо 10 мая 1984 года быў прызваны ва Узброеныя Сілы Ленінскім РВК горада Фрунзе.

Ля Алма-Аты ёсць горад Капчагай, дзе navабранец і праходзіў службу першыя 10 месяцаў. Потым усю часць адправілі ў правінцыю Гільменд, што недалёка ад Кандагара Рэспублікі Афганістан.

У Афганістане Ігар Анатольевіч праходзіў службу з 25 сакавіка 1985 года па 5 мая 1986-га. На аўтамабілі «Урал» забяспечваў ваеннаслужачых прадуктамі і ўсім неабходным. Размяшчалася часць у пустыні. Спачатку жылі ў палатках, а потым самастойна ўзводзілі вялікія казармы з распаўсюджанага ў тых мясцінах будаўнічага матэрыялу — саломы і гліны.

Бацькі ведалі, дзе праходзіў службу іх сын, але ў лістах на радзіму Ігар падрабязнасцяў не расказваў.

Даводзілася ў гэты перыяд бачыць смерць, таму на працягу ўсяго жыцця імкнуўся не ўспамінаць вайну.

У паветрана-дэсантныя войскі трапіў ужо напрактыкаваным. З-за сваёй цікаўнасці яшчэ да прызыву ў войска наведваў авіяклуб, дзе 6 разоў скакаў з парашутам. Потым і падчас службы яшчэ 7 разоў паспытаў смаку паветра на вышыні.

У 1986 годзе Ігар Анатольевіч вярнуўся са службы, а ў 1987 годзе ажаніўся. У 1993-м сям'я пераехала ў Беларусь, якая стала хутка родным краем.

З песняй і гітарай мужчына пасябраваў яшчэ ў юнацтве. Ён лічыў, што музыка дапамагае зрабіць атмасферу ў любой кампаніі цёплай і прыязнай, а таксама перажыць любыя няўзгоды.

Больш за 10 гадоў Ігар адпрацаваў у раённым Доме культуры, дастаўляў артыстаў на розныя мерапрыемствы, глядзеў іх выступленні, падтрымліваў, аднак толькі пасля 5 гадоў працы з творчымі людзьмі выйшаў на сцэну ў якасці выканаўцы. Гэта адбылося 2 жніўня — на Дзень дэсантных войскаў і сіл спецыяльных аперацый.

Як адзначаюць калегі, пазітыў і энергія Ігара Анатольевіча зараджалі ўвесь зал і тых, хто знаходзіўся за кулісамі. Ён быў неверагодным чалавекам, простым, лёгкім у зносінах, цікавым субяседнікам, сапраўдным таварышам і сябрам.

У вольны ад працы час мужчына любіў пахадзіць па лесе, падыхаць свежым паветрам, назапасіць для сям'і грыбоў і ягад. Там ён чэрпаў натхненне і энергію.

Больш ніколі Ігар Анатольевіч не выйдзе на сцэну разам са сваімі калегамі, не ўзніме нам настрой сваёй шчырай усмешкай, душэўнай альбо вясёлай песняй.

Ігар Вішнеўскі пайшоў з жыцця, але пакінуў нам пра сябе цёплую памяць. Выказваем шчырыя спачуванні родным і блізкім Ігара Анатольевіч.

**Наталля Храпавіцкая**